воображения: учебник / С. А. Кравченко. – Москва: Издательство «Экзамен», 2007. – С. 262–276.
3. Рудко, Е. А. Социология личности: курс лекций / Е. А. Рудко. – Витебск: УО «ВГТУ», 2016. – 71 с.

УДК 908;23/28

# КУЛЬТУРА СТАРААБРАДНІЦТВА ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ Ў XVII–XIX СТСТ.

***Коршак А. А., студ., Уткевіч В. І., к.філал.н., дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле даследуецца роля культуры стараабрадніцтва ў фарміраванні інтэлектуальнага асяроддзя Віцебшчыны ў XVII–XIX стагоддзях. Аўтары аналізуюць ўплыў старавераў на развіццё адукацыі, кніжнай традыцыі і рэлігійна-філасофскай думкі рэгёна. Асвятляюцца асаблівасці культурнай ідэнтычнасці стараабраднікаў, іх узаемадзеянне з мясцовым насельніцтвам. Робіцца выснова аб значэнні стараабрадніцкіх абшчын у станаўленні інтэлектуальнай культуры Віцебшчыны.*

Ключавыя словы*: культура, рэлігійныя канфесіі, інтэлектуальнае асяроддзе Віцебшчыны, стараабрадніцтва, XVII–XIX стст.*

Трэцім па колькасці, пасля праваслаўных і каталікоў, хрысціянскім веравызнаннем у Беларусі былі стараабраднікі. Агульная іх колькасць па пяці беларускіх губернях у канцы XIX стагоддзя складала больш за 150 тысяч чалавек. Больш за палову прыхільнікаў гэтай веры жылі ў Віцебскай губерні. Раскол Рускай праваслаўнай царквы другой паловы XVII стагоддзя, як рэакцыя на рэформы патрыярха Нікана, адыграў немалаважную ролю не толькі ў гісторыі рускай дзяржавы, але паўплываў і на гісторыю беларускіх земляў. Адметна, што нетутэйшае стараабрадніцкае насельніцтва захавала сваю гісторыю, своеасаблівую культуру, побыт, абрады і звычаі, а таксама зрабіла пэўны ўплыў і на беларускую культуру. У стараабрадніцкім руху, ад часоў з'яўлення вылучыліся два асноўныя напрамкі: папоўскі і беспапоўскі, якія ў сваю чаргу таксама дзяліліся на шэраг згод. Стараабрадцы папоўскага напрамку сяліліся пераважна на паўднёвым усходзе Беларусі. Тут іх асноўным цэнтрам з'ўлялася Ветка. Поўнач Беларусі, у прыватнасці Віцебшчына, стала асноўнай тэрыторыяй рассялення стараабраднікаў-беспапоўцаў з Памор'я і Вялікага Ноўгарада. У іх на беларускіх землях вызначыліся тры асноўныя згоды: паморская, федасееўская і філіпаўская. Аднак з 1735 года ў рэгіёне з'яўляюцца і стараабраднікі-папоўцы веткаўскай згоды, вымушаныя пакінуць абжытыя землі ў выніку так званых "выганак" царскага ўрада. У XIX стагоддзі цэнтрамі стараабрадніцтва ў Віцебскай губерні былі Дынабург, Полацк, Лепель, Дзісна, Невель, Вележ, Себеж.

Разам з тым, нягледзячы на ўсе цяжкасці і складанасці адаптацыі старавераў на Віцебскіх землях, перашкоды і ганенні з боку царскіх улад, яны былі прыняты беларусамі і справядліва сталі лічыць Беларусь сваёй другой Радзімай. Вядомы беларускі гісторык і этнограф XIX стагоддзя А. Кіркор у кнізе "Літоўскае і Беларускае Палессе" [3] падкрэслівае, што старавераў заўсёды адрознівала ад мясцовых беларусаў вернасць сваёй мове, барада, доўгія кафтаны і высокія боты. Іх таксама вылучалі цвярозасць, ахайнасць і дастатак. У лазні яны мыліся адзін-два разы на тыдзень. Сучаснікі адзначалі ў стараабраднікаў гонар, недаверлівасць, але ў той жа час уменне трымаць слова гонару, якое ў гандлёвых змовах прыраўноўвалася да векселя. Стараабрадцы не маглі атрымліваць крэдытныя грошы ў банках. Таму яны стварылі сваю сістэму крэдытавання, якая засноўвалася выключна на даверы і была дастаткова эфектыўнай. Сучаснікі таксама вылучалі ў стараверах такія якасці, як вынаходлівасць, прадпрымальнасць, выкрутлівасць.

Старавераы часта выступалі ў якасці скупшчыкаў мёду і воску, белых грыбоў, палотнаў і нітак, заснавальнікамі кафляных і цагельных заводаў, лесапрамыслоўцамі, арандатарамі садоў, гандлярамі хатняй жывёлай і канямі, падрадчыкамі, у гарадах і мястэчках – агароднікамі. На Віцебшчыне яны са збожжавых больш сеялі жыта, авёс і ячмень. Большая частка ячменю здавалася на бровары і ў Прыбалтыйскі край для вытворчасці піва. Таксама

вырошчвалі таварны лён, у прыватнасці ў Браслаўскім і Сенненскім паветах. У сярэднім стараабраднікі свае палі ўгнойвалі добра і атрымлівалі больш высокі ўраджай, чым сяляне-беларусы. Добры даход віцебскім стараабраднікам прыносіў гандаль гусямі буйной даўгашыяй пароды. Такія гусі паспяхова прадаваліся ў Нямеччыне па 5-6 марак за адну. На Браслаўшчыне стараабраднікі актыўна займаліся рыбным промыслам. Асабліва шмат рыбы лавілі на азёрах Дрысвяты і Дрывяты. Шмат лавілася судакоў і шчупакоў: у адзін заход выцягвалі да 500 пудоў рыбы. Рыбу рэалізоўвалі ў Варшаве, Вільні, Дзвінску. Таксама за мяжу адпраўлялі вялізныя партыі ракаў. На Віцебшчыне дамы стараабраднікаў вылучаліся вялікімі памерамі, прасторнасцю, надзейнасцю. Дамы, як правіла, былі абсталяваны комінамі. Дахі адрозніваліся крокквавай сістэмай. У этнічных адносінах амаль усе прадстаўнікі расколу далучалі сябе да вялікарускага этнасу. У залежнасці ад колькасці стараабраднікаў, што пражывалі на тэрыторыі той ці іншай губерні, дзейнічалі малітоўныя дамы, дзе стараабраднікі здзяйснялі свае рэлігійныя абрады. У Віцебскай губерні знаходзіліся 47 малітоўных дамоў. У старавераў у храме мужчыны заўсёды строга займалі правую палову, а жанчыны – левую. На лаўках звычайна ляжалі падручнікі (падрушнікі) для зямных паклонаў. Таксама служкі выкарыстоўвалі лястоўкі (ружанец), якія дапамагаюць весці ўлік паклонаў і службы. Малельні беспапоўцаў адрозніваліся ад цэркваў папоўцаў тым, што яны будаваліся па тыпе жылога дома. Напрыклад, у Віцебску малельня мела некалькі пакояў: “Першы, невялікі пакой уяўляў сабой прытвор. У куце, у кіёце, знаходзіўся абраз без акладу. Над уваходнымі дзвярыма вісела складаная невялікая ікона. У другім пакоі было дзве печы, якія грэлі ўвесь дом. Тут у куце на паліцы стаялі дзве драўляныя іконы без акладу і дзевяць медных маленькіх ікон. Побач было некалькі васковых свечак. Трэці, задні пакой быў месцам правядзення асноўных богаслужэнняў…На другой паліцы было восем богаслужэбных кніг: два Евангеллі, адно з якіх у акладзе, каляровы трэбнік, псалтыр, гадзіннік, тры пеўчыя «пісанні»” [2, с. 184].

Сваіх рэлігійных навучальных устаноў стараабраднікі не мелі. Навучанне іх дзяцей было абавязкам парафіяльнага праваслаўнага духавенства. Навучанне павінна было весціся хатнім спосабам у доме аднаго або двух членаў парафіяльнага кліра, з улікам іх здольнасцей і надзейнасці. Аднак многія стараабраднікі з гэтым не пагаджаліся і перашкаджалі гэтаму. Негатыўным было і іх стаўленне да свецкай адукацыі. У той жа час абаронцы стараабрадніцтва, валодаючы выключнай салідарнасцю адзін з адным, перапісваліся паміж сабою і адпраўлялі сваіх дзяцей вучыцца ў Маскву, Санкт-Пецярбург, Дзвінск, Клінцы, Ветку, Старадуб'е, у стараабрадніцкія навучальныя ўстановы і да асобных настаўнікаў. Важную ролю ў стараабрадніцкім руху адыгрываў перыядычны друк, прадстаўлены ў асноўным часопісамі, якія выдаваліся ў Маскве. Адным з першых выданняў быў часопіс “Душакарыснае чытанне”, заснаваны ў 1859 годзе. У ім асвятляліся такія важныя пытанні як веравучэнне, гісторыя, абрады, асвета, разглядаліся падзеі грамадскага жыцця, змяшчаўся агляд тагачаснага друку, крытычныя артыкулы. З 1897 года пачаў выдавацца яшчэ адзін часопіс “Кормчы”. Нягледзячы на тое, што выданні мелі агульнарасійскі характар, рэдактары не пакідалі без увагі і стараверскі рух у беларускіх губернях.

Адзенне стараверaў Віцебскай губерні адрознівалася ад іншых стараабраднікаў і беларусаў большай прыбранасцю і вытанчанасцю. Мужчыны насілі доўгія суконныя кафтаны пераважна з тонкага сукна, высокія боты, футравыя галаўныя ўборы. Для жаночага адзення выкарыстоўваўся паўаксаміт, шаўковы штоф, парча. У буднія дні насілі адзенне з паркалю і каленкора. Стараверы ў сярэднім былі больш пісьменнымі, чым праваслаўнае сялянства. Гэта, у прыватнасці, абумоўлена неабходнасцю самім весці рэлігійную службу, бо спецыяльных навучальных устаноў не было. Таксама заўжды надзённым пытаннем было перапісванне кніг. Стараабрадніцкая культура мірна ўжывалася з беларускай культурай, але не змешвалася. Вядомы віцебскі гісторык і этнограф XIX стагоддзя А. М. Семянтоўскі пісаў, што “…дзейнасць вялікаруса шырэйшая, разнастайнейшая і выгаднейшая, чым дзейнасць беларуса, які заўсёды з зайздрасцю глядзіць на першага. Яўрэі бачаць у вялікарусах небяспечных супернікаў у справах гандлёвых і не вырашаюцца так бесцырымонна эксплуатаваць іх як беларусаў” [1].

Вялікі ўнёсак у справу захавання і памнажэння духоўнай і культурнай спадчыны стараабраднікаў-беспапоўцаў зрабіў віцебскі купец Іван Іванавіч Сабальшчыкоў (1763-1836). Нарадзіўся ў Віцебску, як пра гэта паведамляецца ў ягонай кнізе “Зборнік”. І. І. Сабальшчыкоў быў чалавекам працавітым і акуратным, карыстаўся ўсеагульнай павагай. Нягледзячы на тое, што Сабальшчыкоў быў вельмі багатым чалавекам (меў у Віцебску тры

цагляныя дамы, у адным з якіх знаходзілася малельня), ён вызначаўся вялікай сціпласцю і ўстрыманасцю. Ён перапісаў шмат царкоўна-багаслоўскіх кніг і некалькі Евангелляў, адно з якіх, паводле яго завяшчання, было пакладзена ў яго труну. Склаў шмат "Кветнікаў" на маральна-рэлігійныя тэмы і іншых зборнікаў вытрымак з розных свяшчэнных і павучальных кніг. Са створаных ім рукапісных асобнікаў бачна, што ён шмат чытаў, а ўсё найбольш цікавае перапісваў у свае кнігі друкаванымі літарамі. Пісьмо яго было выразнае, чыстае і беспамылковае. У адным са зборнікаў налічвалася 189 артыкулаў на розныя тэмы. У гэтым жа зборніку былі змешчаны і правілы Польскага сабора. У ім былі таксама вершы, звернутыя да Багародзіцы і Збавіцеля, "Рацэя", гісторыя Барыса і Глеба, паданне аб Страшным Судзе, аб плачу Адама і Евы, розныя вядомыя на той час у асяроддзі стараабраднікаў рэлігійныя вершы. У 1785 г. І. І. Сабальшчыкаў стварыў рукапісны зборнік, у якім, у прыватнасці, паведамляецца пра Колпінскі стараверскі сход, які адбыўся 1 кастрычніка 1751 г. у в. Колпіна Себежскага павета на Віцебскіх землях. У зборніках былі змешчаны і яго ўласныя вершы. Акрамя паэзіі, ён цікавіўся замежнымі мовамі, усведамляў карыснасць іх ведання, аднак імі не валодаў і выказваў з гэтай нагоды шкадаванне.

Паступова асноўнымі духоўнымі цэнтрамі стараабраднікаў на Віцебшчыне зрабіліся Віцебск, Полацк і Відзы. Імператарскі ўказ ад 5 мая 1839 года паклаў пачатак афіцыйнаму штогадоваму падліку стараабраднікаў. Так, у 1840 годзе ў Віцебскай губерні паводле падлікаў паліцыі пражывала 38425 стараабраднікаў.

Падагульняючы, можна сказаць, што ўплыў стараабраднікаў на грамадскае жыццё беларускіх гарадоў і вёсак праз нешматлікасць і вялікарускі характар, быў прыкметным, але не вызначальным. Іх дзейнасць у розных накірунках была істотна абцяжарана заканадаўчымі абмежаваннямі. Таму стараабраднікі не праяўлялі яўнага імкнення да пашырэння сваіх радоў за кошт вернікаў іншых рэлігій. Аднак заўсёды падкрэслівалі сваё жаданне захаваць традыцыйны ўклад і вераванні, рускую мову, адасобіцца ад заходнееўрапейскіх культурных уплываў. Прадстаўнікі "старой веры" беражліва захоўвалі старажытныя рукапісы, друкаваныя кнігі, традыцыі царкоўнаславянскага пісьменства, вучылі чытанню і пісьму беларускіх сялян. Стараабраднікі развівалі прамысловасць, гандаль, прадпрымальніцтва, іх працавітасць спрыяла эканамічнаму развіццю рэгіёнаў.


Спіс выкарыстаных крыніц

1. Гарбацкі, А. А. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу https://files.knihi.com/Knihi/uploaded07/Andrej_Harbacki.Staraabradnictva_na_Bielarusi_u_kancy_XVII_pacatku_CHCH_stahoddzia.pdf – Дата доступу 28.04.2025 г.
2. Горбацкий, А. А. Старообрядчество на белорусских землях. – Брест: БрГУ, 2004. – 305 с.
3. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении / под общ. ред. П. П. Семенова. – СПб.: [Тип.] М. О. Вольф, 1881–1901. Т. 3. Ч.1 : Литовское полесье ; Ч. 2 : Белорусское полесье. – СПб. ; М., 1882. – 490, VI с. : ил., 23 л. ил. [Электронный ресурс] Режим доступа http://elib.shpl.ru/ru/nodes/24611-ruprlib00068463 . – Дата доступа 28.04.2025 г.
4. Кожурин, К. Я. Быт и нравы староверов Витебской губернии в середине XIX в. (по материалам секретных данных, собранных надворным советником В.С. Несторовым) // Старообрядчество. – 2023. – Т. 1. – № 1. – С. 20–34.


УДК 7.067

## КРОСС-КУЛЬТУРНЫЕ ИНТЕРПРЕТАЦИИ В ДИЗАЙНЕ КОСТЮМА


***Захарчук Н. С., маг., Уткевич О. И., к.ф.н., доц.***

*Витебский государственный технологический университет,*
*г. Витебск, Республика Беларусь*



Реферат. *В данном научном материале исследуются кросс-культурные интерпретации в дизайне костюма как важный аспект современного модного мира. В условиях глобализации и культурного обмена дизайнеры все чаще обращаются к различным культурным традициям, создавая уникальные и инновационные коллекции. Рассматриваются примеры из авторского творчества, характеризующиеся*